# «НАМ, ШТО Б ТАМ НІ БЫЛО, ТРЭБА ПРАЙСЦІ ГЭТЫ СКЛАДАНЫ ПЕРЫЯД У ЖЫЦЦІ НАШАЙ ПЛАНЕТЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён звярнуўся да жыхароў краіны, адзначыўшы, што сёння найбуйнейшыя дзяржавы планеты — уладныя людзі — спрабуюць падзяліць і перадзяліць гэты свет. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, што Зімбабвэ багатая на карысныя выкапні, а таму спакойнага жыцця гэтай краіне ніхто не дасць. І ў гэтым у тым ліку прычына санкцый. «Санкцыі амерыканцы ўвялі супраць вас не таму, што вы не дэмакратычныя. А таму, што вы вырашылі ўзяць пад кантроль сваю краіну і карысныя выкапні. Вы не пускаеце сюды рознага роду міжнародных прайдзісветаў і жулікаў, каб яны карысталіся вашымі нетрамі. У гэтым прычына санкцый. Вас зноў, як гэта было ў мінулыя стагоддзі, хочуць паставіць на калені. А Прэзідэнт і ўлада Зімбабвэ гэтага не хочуць. Вось адсюль санкцыі», — сказаў ён. «Вас будуць узмоцнена разгойдваць, каб пасеяць смуту ў вашым грамадстве, вас будуць ставіць на калені. Але вы павінны вытрымаць. І вы вытрымаеце, калі будзеце адзіныя, калі не дапусціце ўнутры краіны сутыкненні ўласнага народа з-за нейкіх палітычных амбіцый або ілюзорных абяцанняў Захаду і Амерыкі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Нам, што б там ні было, трэба прайсці гэты складаны перыяд у жыцці нашай планеты. Беражыце мір! Не здолееце гэта зрабіць — зноў трапіце пад каланіяльны прыгнёт». Прамова Аляксандра Лукашэнкі неаднаразова суправаджалася апладысментамі.



Каравай, які трымаюць зімбабвійскія дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных касцюмах, быў выпечаны з ураджаю, сабранага з дапамогай нашай тэхнікі.



Гэтыя «Беларусы» гатовыя для работы на афрыканскіх палях.

«Афрыка даўно прачнулася. Без Афрыкі не можа быць перспектывы ў свеце наогул. Без Афрыкі свет развівацца не можа. Будучыня за Афрыкай», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

Ён адзначыў, што ў рамках пачатай у 2020 годзе праграмы па механізацыі ў фермерскія гаспадаркі Зімбабвэ беларускі бок паставіў больш як 1,8 тысячы трактароў і каля 80 збожжаўборачных камбайнаў. Гэта тэхніка дапамагла гарантаваць харчовую бяспеку краіны. «Але гэта толькі пачатак. Мы далі старт трэцяй фазе гэтай праграмы на суму звыш $66 млн. Яна прадугледжвае больш як 3,7 тысячы адзінак трактарнай тэхнікі, 60 камбайнаў для мясцовых аграрыяў на працягу найбліжэйшых паўтара года», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, для патрэб мясцовых муніцыпалітэтаў у Зімбабвэ пачаты пастаўкі пажарных аўтамабіляў беларускай вытворчасці. Акрамя таго, у Зімбабвэ ўжо паспяхова эксплуатуецца кар'ерная тэхніка БелАЗ. У найбліжэйшы час плануецца паставіць яшчэ больш за 30 самазвалаў. Пры гэтым, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у Зімбабвэ забяспечваецца і сэрвіснае абслугоўванне беларускай тэхнікі.

На перагаворах з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвай былі ў тым ліку абмеркаваны перспектывы развіцця супрацоўніцтва з Мазамбікам і тое, як можна перанесці напрацаваны з зімбабвійскім бокам вопыт на гэту краіну. Кіраўнік беларускай дзяржавы растлумачыў, што ў Эмерсана Мнангагвы добрыя адносіны з кіраўніцтвам Мазамбіка і ён можа аказаць садзейнічанне ў гэтым пытанні.

Эмерсан Мнангагва ў час размовы з журналістамі па выніках перагавораў падкрэсліў: «Гэты візіт умацоўвае, пашырае і кансалідуе нашы двухбаковыя адносіны». Ён адзначыў, што Беларусь аказвае вялікую падтрымку ў механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ, развіваецца супрацоўніцтва і ў іншых сферах.

Учора з удзелам кіраўнікоў дзяржаў адбылася цырымонія перадачы беларускай тэхнікі. Тут ім коратка далажылі аб рабоце па пастаўках і абслугоўванні беларускай тэхнікі ў Зімбабвэ.

Прэзідэнтаў сустракалі зімбабвійскія дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных касцюмах з караваем у руках. Ён быў выпечаны з мясцовага ўраджаю, сабранага з дапамогай беларускай тэхнікі.

У сваім выступленні на цырымоніі Прэзідэнт Беларусі сказаў: «Хачу падзякаваць амерыканцам і ўсяму заходняму свету за тое, што яны ўвялі супраць нас санкцыі. У адваротным выпадку на гэтым вялікім полі стаялі б не беларускія трактары, а амерыканскія і нямецкія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы павінны памятаць: нас падзяляюць немалыя адлегласці, але мы гатовы заўсёды дапамагаць вам, мы гатовы прыняць вашу дапамогу. Мы гатовы вам падставіць плячо ў любы час, у любым месцы, вырашаючы самыя складаныя праблемы і задачы», — запэўніў беларускі лідар. Ён заклікаў народ Зімбабвэ захоўваць адзінства і пажадаў усім шчасця, міру і дабра, а таксама хлеба на сталах.

Аляксандр Лукашэнка падарыў калегу трактар для яго асабістай падсобнай гаспадаркі. У сваю чаргу Эмерсан Мнангагва падарыў Прэзідэнту Беларусі чучала льва — цара звяроў і аднаго з самых моцных жывёл у Афрыцы.

**Паводле БелТА.**

Інавацыі

# «І гэта ўсё зрабілі МЫ!»...

## ...так эмацыянальна ахарактарызавала ўбачанае на выстаўцы «Беларусь інтэлектуальная» адна з яе наведвальніц

**— Мне здаецца, што гэта самае важнае меркаванне. Нам удалося даказаць і паказаць усім, што Беларусь — насамрэч інтэлектуальная краіна, — падкрэслівае першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК. — Ідэя з арганізацыяй і правядзеннем такой выстаўкі была выстралам у «дзясятку».**

Літаральна пасля першых дзён мы пачулі меркаванне, што трэба работу выстаўкі прадоўжыць, што і было зроблена. І гэта вельмі правільнае рашэнне. Мы ж бачылі, колькі наведвальнікаў на выстаўцы штодня. Прыходзілі як групы школьнікаў і студэнтаў, так і звычайныя сем'і. Людзям цікава, яны ўнікалі ва ўсе нюансы, задавалі шмат пытанняў. Атрымаўся сапраўдны дыялог. Паводле прыблізных ацэнак, выстаўку за дзевяць дзён наведалі ад 80 да 100 тысяч чалавек. Поўнамаштабна на ёй былі прадстаўлены дасягненні фізікаў і матэрыялазнаўцаў. Прычым усё было прэзентавана вельмі даходліва і наглядна. Увогуле, кластарная арганізацыя экспазіцыі, калі навуковыя распрацоўкі былі сабраны па тэмах, незалежна ад прыналежнасці навуковай арганізацыі да пэўнага ведамства, цалкам сябе апраўдала. Немалаважна, што, калі было прынята рашэнне прадоўжыць выстаўку, яе экспазіцыя дадаткова папаўнялася новымі распрацоўкамі. Усе сталі думаць: а што яшчэ можна прадставіць увазе грамадскасці, чым захапіць і здзівіць?..

«Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» паказала, што наша краіна знаходзіцца на высокім інтэлектуальным узроўні, мы ідзём у нагу з часам, у нас ёсць інавацыйныя распрацоўкі, часам нават такія, якіх няма ў нашых суседзяў. Наведвальнікі змаглі азнаёміцца з шырокім блокам медыцынскіх тэхналогій, прычым не ніжэй чым пяты-шосты тэхналагічны ўклад, — падкрэслівае, падводзячы вынікі навукова-папулярнага мерапрыемства, **начальнік аддзела навукі Міністэрства аховы здароўя Маргарыта ДОСІНА.** — Тыя ж клетачныя тэхналогіі, якія мы актыўна прымяняем для лячэння розных захворванняў, знаходзяцца на ўзроўні шостага тэхналагічнага ўкладу. Яны працуюць там, дзе не можа справіцца традыцыйная медыцына. Медыцынская навука ўвогуле з'яўляецца самай практыка-арыентаванай, таму што медыкі працуюць з пацыентамі, ім трэба прымаць хуткія рашэнні тут і цяпер. Канешне, паколькі нашы перадавыя тэхналогіі знаходзяцца каля ложка пацыента, мы не можам іх так нагляднa прадэманстраваць, як тыя ж фізікі. Але мы спрабавалі гэта рабіць. Спадзяюся, у нас атрымлівалася».



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Да найбольш значных дасягненняў, прадстаўленых на выстаўцы, на думку Маргарыты Досінай, трэба аднесці ДНК-вакцыну супраць нейрабластомы. На гэта захворванне пакутуюць дзеці да двух гадоў. Вакцына дапамагае ў тых выпадках, калі не дапамагае традыцыйнае прымяненне лекавых сродкаў. Шасцёра дзяцей ужо прайшлі ДНК-вакцынацыю.

— Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» садзейнічае папулярызацыі навукі сярод моладзі і іх прафарыентацыі, — дзеліцца сваім меркаваннем начальнік упраўлення **навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі Пётр ПЯКУЦЬКА.** — Мерапрыемства выконвае мноства функцый. Перш за ўсё пазнавальную і прамоўтарскую, маркетынгавую. Дзякуючы гэтай выстаўцы мы змаглі сфарміраваць у значнай колькасці нашых грамадзян уяўленне аб беларускай навуцы. Былі паказаны канкрэтныя вынікі работы вучоных. Такія выстаўкі неабходныя, каб у грамадстве статус вучонага заўсёды знаходзіўся на высокім узроўні.

На яго думку, выстаўка ў тым ліку вырашае і задачы прафарыентацыі. Паводле звестак Міністэрства адукацыі, яе наведалі каля 6,5 тысячы студэнтаў, каля 3 тысяч школьнікаў і каля 2,5 тысячы навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Яны не толькі даведаліся аб новых беларускіх распрацоўках, але і паглядзелі, кім яны ў будучым могуць стаць, чым займацца або зацвердзіліся ў сваім прафесійным выбары.

Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» за два месяцы аб'едзе ўсе абласныя цэнтры. Па словах Сяргея Чыжыка, першым яе прыме Гомель. Адметнасцю выставак, якія пройдуць у абласных цэнтрах, стане асобная экспазіцыя, прысвечаная развіццю і дасягненням навукі ў канкрэтным рэгіёне.

Таксама хутка выстаўку «Беларусь інтэлектуальная» можна будзе наведаць у віртуальным фармаце. «Экспазіцыю, прадстаўленую ў Мінску, мы знялі. Калі будзе зроблена віртуальная версія, выставім яе ў інтэрнэце. Людзі змогуць яшчэ доўга наведваць выстаўку з пачуццём рэальнай прысутнасці, разглядаць экспанаты, чытаць інфармацыю аб іх. Спадзёмся, у найбліжэйшы час мы зможам даць усім такую магчымасць», — паведаміў Сяргей Чыжык.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**